Значнае месца ў выхаванні патрыятычных пачуццяў займаюць развіццё і прапаганда фальклорных формаў. Глыбокае знаёмства моладзі са скарбніцай народнага музычнага мастацтва, нараджэнне і падтрыманне цікавасці да яго спрыяюць захаванню нацыянальных традыцый, выхаванню самасвядомасці.

Кожны з відаў музычнай творчасці закранае асобную галіну сацыяльнага ўзаемадзеяння, ідэнтыфікацыі асобы ў грамадстве, групе. Музычнае выхаванне — гэта мэтанакіраваны працэс. Ва ўмовах ВНУ ён мае вялікае значэнне: з аднаго боку, максімальна развівае асобу эстэтычна, а з другога — дае ёй магчымасць сацыяльнага самараскрыцця ў форме таго ці іншага віду музычнай творчасці. Музычнае выхаванне дазваляе маладому чалавеку дабіцца аўтарытэту і прызнання сярод аднагодкаў, палепшыць самаацэнку, павялічыць упэўненасць у сваіх сілах, што ў выніку стварае свабодную, гарманічную асобу.

**Акуліч Ю.У.**,
аспірантка кафедры аўтаматызаваных бібліятэчна-інфармацыйных сістэм

## СТАНДАРТ ДЛЯ АКРЭДЫТАЦЫІ МАГІСТЭРСКІХ ПРАГРАМ У ПЛАНЕ БІБЛІЯТЭЧНА-ІНФАРМАЦЫЙНЫХ НАВУК У ЗША

Стандарт для акрэдытацыі магістэрскіх праграм у галіне бібліятэчна-інфармацыйных навук у ЗША ўключае патрабаванні, неабходныя для акрэдытацыі школ. Выкананне гэтых патрабаванняў гарантуе выпускнікам, арганізацыям, якія будуць браць іх на працу, і грамадству высокі прафесіяналізм, а таксама тое, што, ствараючы праграмы, школы паставяць перад сабой правільныя мэты і, дзякуючы гэтаму, не толькі дасягнуць найлепшых вынікаў, але і ўдасканаляць іх.

З пункту гледжання Амерыканскай бібліятэчнай асацыяцыі, акрэдытацыя — механізм якаснай ацэнкі і

Репозиторий БГУКИ

ўдасканаленне адукацыі з дапамогай эфектыўнага выкарыстання рэсурсаў для дасягнення канкрэтных адукацыйных мэт і задач. Амерыканцы лічаць, што будучыя студэнты, працадаўцы, якія будуць уладкоўваць на працу выпускнікоў, і грамадскасць, што дбае аб якасці бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання, маюць права на тое, каб ведаць, ці з'яўляецца праграма пэўнай школы здавальняючай. Працэс акрэдытацыі прапануе сродкі эфектыўнага кантролю за якасцю падрыхтоўкі спецыялістаў акрэсленай галіны.

Акрэдытацыяй займаецца Камітэт па акрэдытацыі Амерыканскай бібліятэчнай асацыяцыі. Ён з'яўляецца вышэйшым органам акрэдытацыі ў акрэсленай галіне і ўпаўнаважаны Міністэрствам адукацыі ЗША распрацоўваць праграмы і вучэбныя планы. Гэты дакумент раскрывае крытэрыі акрэдытацыі адукацыйных праграм у галіне бібліятэчна-інфармацыйных навук ЗША. (Бібліятэчна-інфармацыйныя навукі — гэта ўсё звязанае з інфармацыяй, ведамі, паслугамі, тэхналогіямі, накіраванымі на арганізацыю і выкарыстанне інфармацыі.)

Стандарт мае на мэце падтрымку высокай якасці падрыхтоўкі праз вызначэнне крытэрыяў ацэнкі эфектыўнасці навучання. Ён уключае ацэнку не толькі навучальных працэсаў, рэсурсаў, але і эфектыўнасці іх выкарыстання дзеля дасягнення пастаўленых мэт. Стандарты апісваюць колькасныя і якасныя параметры праграм і вызначаюць абавязковыя кампаненты.

У амерыканскім стандарце даецца вызначэнне бібліятэчна-інфармацыйных навук, якое ўключае стварэнне ведаў па камунікацыі, адборы, камплектаванні, класіфікацыі, апісанні, арганізацыі, захаванні бібліятэчных фондаў, а таксама інфармацыйным аналізе, перакладзе, ацэнцы, сінтэзе, распаўсюджванні і кіраванні. Гэтае вызначэнне звязвае навучанне з прафесійнай практыкай і навукова-даследчай працай.

Стандарт не дапускае дыскрымінацыі па ўзросце, паходжанні, колеры скуры, інваліднасці (непрацаз-



Рэпазіторый БГУКІ

дольнасці), поле, індывідуальным спосабе жыцця, сямейным стане, нацыянальнай прыналежнасці, расе, рэлігіі або сексуальнай арыентацыі.

1. Амерыканскі стандарт па акрэдытацыі магістэрскіх праграм у галіне бібліятэчна-інфармацыйных навук вызначае пэўныя патрабаванні па 6-ці наступных катэгорыях:

1) мэты і задачы праграмы навучання;
2) вучэбны план;
3) прафесарска-выкладчыцкі склад;
4) адбор і склад студэнтаў;
5) адміністрацыя і фінансавая падтрымка;
6) рэсурсы і магчымасці.

У сувязі з абмежаванасцю аб'ёму артыкула, на жаль, нельга прааналізаваць увесь стандарт, таму спынімся толькі на мэтах і задачах праграмы навучання і вучэбных планах.

Мэтай і задачай навучання ў адпаведнасці з гэтым стандартам з'яўляецца здзяйсненне абгрунтаванага працэсу, які рэалізуе мэты і задачы канкрэтнай школы, яе планы ў галіне павышэння якасці адукацыі, мэты ўдзельнікаў навучання.

Праграмныя мэты бібліятэчна-інфармацыйнай адукацыі ЗША пералічаны ніжэй:

1. У працэсе навучання амерыканскія акрэдытаваныя школы ўлічваюць асаблівасці бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання (выкарыстанне ведаў, паслуг, тэхналогій, якія базіруюцца на адборы, набыцці, апісанні, арганізацыі, захаванні, рэдагаванні, аналізе, перакладзе, ацэнцы, сінтэзе, размеркаванні, кіраванні інфармацыяй).

2. У навучальным працэсе павінны шырока выкарыстоўвацца прынцыпы філасофіі, этыкі акрэсленай спецыяльнасці.

3. У школе мусяць прысутнічаць розныя спецыялізацыі.

4. Задачы навучання, а таксама навуковыя і вучэбныя даследаванні павінны садзейнічаць развіццю ў пэўнай галіне.

Репозиторий БГУКИ

5. Задачы навучання павінны спрыяць асэнсаванню значнасці навуковых даследаванняў у развіцці галіны.

6. Яны мусяць актывізаваць асэнсаванне значнасці ўкладу бібліятэчна-інфармацыйных навук у іншыя галіны ведаў.

7. Задачы навучання павінны таксама садзейнічаць асэнсаванню значнасці ўкладу іншых галін ведаў у развіццё бібліятэчна-інфармацыйных навук.

8. Яны мусяць падкрэсліваць ролю бібліятэчна-інфармацыйных устаноў у хутказменным шматмоўным грамадстве, уключаючы задавальненне патрэб недзеяздольных грамадзян.

9. Задачы навучання павінны ўлічваць інтэлектуальныя патрабаванні студэнтаў.

Вучэбны план грунтуецца на мэтах, задачах школы, распрацоўваецца і плануецца ў адпаведнасці з сістэматычным працэсам навучання. Гэты план спрыяе выхаванню прафесіяналаў галіны бібліятэчна-інфармацыйных навук, якія былі б падрыхтаваны да таго, каб кваліфікавана выконваць паслугі. Ён выкарыстоўвае ў навучанні апошнія навуковыя дасягненні, спалучае і аб'ядноўвае тэарэтычныя дасягненні з практычнай працай. План павінен адпавядаць патрабаванням зменлівага шматнацыянальнага і шматмоўнага грамадства.

На наш погляд, мэты і задачы амерыканскай бібліятэчна-інфармацыйнай адукацыі маюць падабенства з мэтамі і задачамі беларускай бібліятэчна-інфармацыйнай адукацыі.

Рэпазіторый БГУКІ